Ірына Глушэц

метадыст па этнаграфіі і фальклору ўстановы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці», аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», магістр мастацтвазнаўства (г. Гомель, Беларусь)

# Сістэма работы ўстаноў культуры Гомельскай вобласці з каляндарнай нематэрыяльнай культурнай спадчынай і яе метадычнае забеспячэнне

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Гомельшчына славіцца ўнікальнай захаванасцю традыцыйнага мастацтва як жывой з'явы. Таму асноўная мэта ўсіх форм работы з нематэрыяльнай спадчынай краю ўвогуле і з каляндарнымі абрадамі ў прыватнасці — падтрымка жыццёвасці традыцыі, наданне новых імпульсаў існаванню аўтэнтыкі.



Па ініцыятыве ўстановы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» адбываюцца майстар-класы, семінары, курсы павышэння кваліфікацыі па кірунках народнай творчасці (роля культурных мерапрыемстваў у развіцці турбізнесу, этнатурызму, папулярызацыі традыцый сярод дзяцей і моладзі). Набыццё прафесійных ведаў дазволіла работнікам культуры праводзіць планамернае лакальна-рэгіянальнае даследаванне ў кожным раёне, а потым — і адраджэнне форм традыцый. Да ўсяго, семінары паспрыялі спецыялістам сферы ў распрацоўцы этнакультурных турпраграм.

Апісанні мясцовых каляндарных і сямейна-побытавых свят, запісы песень і твораў народнай прозы маюць як усе раённыя метадычныя службы Гомельшчыны, так і сельскія ўстановы культуры. Найбольшая колькасць фальклорных адзінак сабрана метадычнымі службамі Акцябрскага, Буда-Кашалёўскага, Добрушскага, Ельскага, Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Рагачоўскага і Чачэрскага раёнаў. Абласны цэнтр народнай творчасці праводзіць класіфікацыю матэрыялаў, у тым ліку па выяўленых рэгіянальных традыцыях, з улікам фарміравання тэматычнай медыятэкі, паводле калектываў з найменнямі «народны» і «ўзорны».

Як і любая жывая з'ява, існаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гомельшчыны мае свае праблемы. Традыцыйная народная культура паступова затухае, што звязана са зменамі жыццёвага ладу і сістэмы каштоўнасцей сучаснікаў. Атрыманне колішнімі вёскамі статусу аграгарадкоў можна разглядаць як станоўчы момант: населеныя пункты будуць мець насычанае жыццё, адпаведна, стане развівацца інфраструктура. Але ж пры гэтым змяняецца традыцыйны вясковы лад, які з'яўляецца падмуркам для традыцыйнай культуры, у тым ліку — фальклору. Адыходзяць у нябыт традыцыйныя заняткі, якія суправаджаліся спевамі: ручное земляробства, ткацтва.

Значнымі пагрозамі выступаюць працэсы глабалізацыі і ўрбанізацыі. Вёскі, у якіх закрываюць школы і ўстановы культуры, фактычна асуджаны на знікненне. Сучасная моладзь, арыентаваная на гарадскую культуру, імкнецца пераязджаць у буйныя населеныя пункты. А ў працы з дзецьмі асноўная праблема бачыцца ў няўзгодненасці з боку кіраўніцтва сфер культуры і адукацыі. Назіраюцца выпадкі, калі дзеці, якія займаюцца ў моцных фальклорных калектывах, не знаходзяць падтрымкі і разумення ў школьных настаўнікаў.



Як станоўчы досвед неабходна адзначыць правядзенне ў вобласці фестывальна-конкурсных акцый па традыцыйнай культуры, якія адыгрываюць значную ролю ў захаванні і папулярызацыі каляндарнай народнай культуры, яе трансляцыі малодшаму пакаленню. Сярод іх вылучаецца фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся», які праводзіцца ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна з 2010 г. Яго мэты — падтрымка і папулярызацыя традыцыйнай культуры (ад фальклору, мясцовых традыцый і абрадаў, промыслаў і рамёстваў да нацыянальнай кухні) і гісторыка-культурнай спадчыны краю, аматарскага мастацтва. Правядзенне ў рамках фестывалю этнаграфічнай экспедыцыі дазволіла даследаваць сучасны стан традыцыйнай культуры больш як 20 населеных пунктаў Петрыкаўшчыны. У 2014 г. значнай падзеяй фестывалю стала свята рушніка, для якога кожны з 9 раёнаў Гомельскай і 3 раёнаў Брэсцкай вобласці падрыхтаваў выставу рэгіянальнага рушніка. Былі прадстаўлены асаблівасці, адрозненні, агульныя рысы традыцыйных беларускіх рушнікоў Гомельшчыны і Брэстчыны, праводзіліся майстар-класы па ткацтву на кроснах. У рамках фестывалю таксама была арганізавана фальклорная пляцоўка, дзе 15 аматарскіх калектываў Гомельскай вобласці і 2 Брэсцкай выконвалі лепшыя ўзоры песеннага, інструментальнага і танцавальнага фальклору Палесся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзін з самых значных фестываляў традыцыйнай культуры на тэрыторыі Гомельскай вобласці — Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў г.п. Акцябрскі, які праводзіцца з 1999 г. Унікальнасць фестывалю ў тым, што ён будуецца на прынцыпах этнапедагогікі і з'яўляецца эталонам падыходаў да захавання і трансляцыі дзецям і моладзі розных відаў і праяў лакальнай культурнай спадчыны. У ім прымаюць удзел аўтэнтычныя, дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы, інструментальныя ансамблі народнай музыкі, калектывы і індывідуальныя выканаўцы народна-бытавога танца, майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці Беларусі. За 15-гадовую гісторыю фестывалю ў яго заключных мерапрыемствах прынялі ўдзел калектывы з 12 раёнаў Гомельскай вобласці [1—6]. Найбольшую колькасць калектываў прадставіў Акцябрскі раён — гаспадар фестывалю. Дзякуючы падтрымцы нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА фестываль стаў сапраўдным мастацкім форумам, у якім таксама прымалі ўдзел творчыя калектывы з многіх краін блізкага і далёкага замежжа: Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны. Уплыў «Берагіні» на развіццё традыцыйнай народнай культуры раёна, вобласці і рэспублікі сапраўды неацэнны. Удзельнікам турніру дзіцячых фальклорных калектываў бывае цяжка падрыхтавацца па ўсіх намінацыях, бо праграма навучання як ва ўстановах клубнага тыпу, так і ў навучальных установах культуры і адукацыі часта не прадугледжвае комплекснага падыходу да традыцыйнай народнай культуры.



Аднак, калі ўлічваць працу, што праводзіцца ў кірунку народных традыцый, ёсць спадзяванні, што традыцыйная спадчына, якая жыве ў памяці старэйшага пакалення, будзе адраджацца і пераймацца моладдзю і дзецьмі ва ўсёй яе разнастайнасці. Тым больш маніторынгу нематэрыяльнай культурнай спадчыны вобласці надаецца значная ўвага. На працягу 18 гадоў абласны цэнтр народнай творчасці сумесна з метадычнымі службамі раёнаў праводзяць маніторынг старажытных свят і абрадаў, які пацвярджае іх жыццядзейнасць. У 2015 г. супрацоўнікі аддзела традыцыйнай народнай культуры назіралі за святкаваннем Стрэчання в. Новае Палессе Лельчыцкага раёна, «Карагоду сена» н.п. Старое Сяло, «Ваджэння і пахавання стралы» в. Казацкія Балсуны і аг. Стаўбун Веткаўскага раёна, «Юраўскага карагоду» в. Пагост Жыткавіцкага раёна, «Мікольскага карагоду» аг. Прудок Мазырскага раёна, «Провадаў русалкі» аг. Вялікі Бор Хойніцкага раёна, «Ваджэння куста» аг. .Меркулавічы Чачэрскага раёна. Штогод ва ўсіх раёнах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобласці поўнасцю ці фрагментарна ў адпаведнасці з аўтэнтычнымі канонамі праходзяць калядныя святы (уласна Каляды / Раство, стары Новы год / Васілле і Вадохрышча), Стрэчанне, Саракі, Гуканне вясны, Вялікдзень (абрад валачобніцтва), Юр'е, Ушэсце, Тройца, Купалле, Зажынкі, Дажынкі. Абрад пераносу свячы на гадавыя святы адпраўляецца ў Веткаўскім, Буда-Кашалёўскім, Кармянскім, Чачэрскім і Калінкавіцкім раёнах. Старажытнае свята Жаніцьбы коміна захавалася ў памяці носьбітаў і існуе ў сцэнічных варыянтах у вёсках Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Петрыкаўскага і Хойніцкага раёнаў. Народнае свята Багач бытуе ў пасіўнай форме ў Акцябрскім, Жыткавіцкім, Кармянскім і Петрыкаўскім раёнах.

Гомельская вобласць мае чатыры элементы нематэрыяльнай спадчыны ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: абрад «Юраўскі карагод» в. Пагост Жыткавіцкага раёна, абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна, мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў аўтэнтычным фальклорным калектывам «Палескія напевы» в. Новае Палессе Лельчыцкага раёна, мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў аўтэнтычным фальклорным калектывам в. Казлы Ельскага раёна. Рэкамендаваны да ўнясення ў Спіс традыцыі пакланення каменным крыжам вв. Данілевічы і Баравое Лельчыцкага раёна (каменныя «дзевачкі»), абрад «Провады русалкі» в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна, спеўны стыль Тураўскага міжрэчча Прыпяці — Сцвігі (аг. Рычоў Жыткавіцкага раёна). У 2015 г. для надання ахоўнага статусу падрыхтаваны дакументы па абраду «Чырачка» аг. Тонеж Лельчыцкага раёна і тэкстыльнай традыцыі аг. Неглюбка Веткаўскага раёна. Вядзецца падрыхтоўка элементаў «Танцавальная традыцыя г.п. Капаткевічы Петрыкаўскага раёна», «Фрагмент вясельнага абраду — выраб і выкарыстанне «вёльцаў» у Камарынскай зоне Брагінскага раёна», «Перанос свячы на Тройцу ў в. Навінкі Калінкавіцкага раёна».

Такім чынам, можна адзначыць, што праз арганізаванае якаснае метадычнае забеспячэнне ўстановы культуры Гомельскай вобласці праводзяць зладжаную сістэматычную работу па вывучэнню, захаванню і папулярызацыі каляндарнай нематэрыяльнай культурнай спадчынай і маюць патэнцыял у развіцці дадзенага кірунку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Берагіня : Другі рэгіянальны фестываль фальклорнага мастацтва / аўт.-склад. М. А. Козенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. — 232 с.

2. Берагіня : Першы фестываль фальклорнага мастацтва / аўт.-укл. М. А. Козенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 1999. — 207 с.

3. Берагіня : Сёмы рэсп. фестываль фальклорнага мастацтва (2010—2012) / укл. М. А. Козенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2012. — 40 с.

4. Берагіня : Трэці рэсп. фестываль фальклорнага мастацтва / аўт.-склад. М. А. Козенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2004. — 231 с.

5. Берагіня : Чацвёрты рэсп. фестываль фальклорнага мастацтва / аўт.-укл. М.А. Козенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2004. — 248 с.

6. Берагіня : Шосты рэсп. фестываль фальклорнага мастацтва (2008—2010) / аўт.-укл. М. Козенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2010. — 167 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ